# ЭКАНОМІКА БЕЛАРУСІ НА ЭТАПЕ 1994–2010 гг.: ТЭНДЭНЦЫІ ЯЕ РАЗВІЦЦЯ, АСНОЎНЫЯ ВЫНІКІ

*І.У. Мандрык*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машерова*

Больш за дваццаць гадоў Рэспубліка Беларусь арыентуецца на ўласную мадэль эканамічнага развіцця, якая выклікае розныя адзнакі ў замежнай і айчыннай навуковай літаратуры. Дыскусіі ў асноўным звязаны з накірункам выбранага курсу і тактыкай, следуючы якой магчыма ажыццявіць грандыёзную гістарычную задачу - дабіцца стварэння эфектыўнай шматукладнай сацыяльна арыентаванай эканомікі і забяспечыць годнае жыццё, свабоднае развіцце і самарэалізацыю творчага (працоўнага) патэнцыялу асобы. Асобныя навукоўцы і палітыкі звяртаюць ўвагу на неабходнасць карэкцыі ідэалогіі, выбранай ў сярэдзіне 90-х гг. беларускай эканамічнай мадэлі развіцця, пошуку рычагоў узмацнення яе магчымасцей к самарэгуляцыі з улікам выклікаў сусветнай эканомікі. Зусім слушна гучыць думка, што вызначэнне аптымальнай гаспадарчай мадэлі, механізмаў яе рэалізацыі - гэта кампетэнцыя вышэйшага кіраўніцтва краіны. У той жа час, маецца шмат прапаноў аб неабходнасці большай уключанасці ў гэты працэс шматміліенных мас працоўных. Абмеркаванне гэтай праблемы абыходзіцца без супярэчнасцей, тут думкі супадаюць: толькі праз творчасць працоўных і іх працаздольнасць магчыма дасягнуць лідэрства ў эканамічнай і сацыяльнай сферах, скараціць час пераходу ад пачатковага этапу фарміравання сацыяльнай дзяржавы да яе больш спелай якасці. Пасылка, што цэласная канцепцыя развіцця дзяржавы, якая імкнецца да свайго якаснага стану, можа быць ажыццяўлена толькі з апорай на дамінуючае адлюстраванне гэтага жыццева важнага пытання ў масавым усведамленні і існуючым плюралізме думак, крытыцы не падлягае.

*Як бачна* абмеркаванне пытання аб эфектыўнасці беларускай эканамічнай мадэлі развіцця на навуковых форумах і ў друку з'яўляецца для Беларусі лесавызначальным. У сувязі з гэтым навукова – аналітычныя даследаванні рэальнага становішча цякучых спраў у рэспубліцы і яе рэгіенах, прапановы па павышэнню эфектыўнасці існуючай беларускай мадэлі эканамічнага развіцця дзяржавы, чаму прысвечан дадзены артыкул , носяць высокую актуальнасць

Мэта даследвання – прааналізаваць змест фундаментальных рашэнняў прынятых кіраўніцтвам рэспублікі, накіраваных на дынамічнае развіцце краіны і паказаць эфектыўнасць іх рэалізацыі.

**Матэрыял і метады.** У працы выкарыстаны дакументальныя матэрыялы дзяржаўных арганізацый, якія раскрываюць ход эканамічных пераўтварэнняў на этапе 1994–2010 гг. У дадатак аўтар абапіраецца на дадзеныя дзяржаўных статыстычных зборнікаў, друкаваныя артыкулы ў сродках масавай інфармацыі. Метадалагічную аснову даследавання складаюць прынцыпы гістарызму, аб'ектыўнасці, сістэмнасці, сацыяльнасці

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Пасля заявы аб дэнансацыі Саюзнага дагавора і утварэння СНД (8 снежня 1991 г. у Белавежскай пушчы) гаспадарка БССР ператварылася ў міжнародную эканамічную сістэму. Пераход да рынку на першапачатковым этапе не прынес беларусам нічога, акрамя істотных страт. У рэспубліцы не знайшлося кіраўнікоў і спецыялістаў, здольных у кароткія тэрміны арганізаваць сацыяльна - рынкавую гаспадарку, закліканаю становўча ўздзейнічаць на жыцце людзей. Істотны спад вытворчасці ва ўсіх галінах і інфляцыя, прывялі народную гаспадарку рэспублікі да глыбокага эканамічнага крызісу. Адрозненне ў дэкларацыях (абяцанні сацыяльных гарантый насельніцтву) і жыццёвых рэаліях (кратнае збядненне насельніцтва ў параўнанні з савецкім часам) , як вядома з гістарычнага вопыту, не ўмацоўвае імідж улады. Давер народа да кіраўніцтва рэспублікі быў падарваны (Аб крызісным стане пры пераходзе да рынкавых адносін у Беларусі аўтар ўжо выкладаў. Гл. часопіс "Ученые записки". Т.12.Т.22).

Улетку 1994 г. у выбаршчыкаў ужо зацвердзілася меркаванне аб некампетэнтнасці дзяржаўных дзеячаў рэспублікі. Сама сітуацыя ў эканоміцы і сацыяльнай сфере пацвярджае, што для такой высновы ў народа былі падставы. Мандат на кіраўніцтва краінай у гэты складаны час быў перададзены іншым палітыкам. Пасля прыняцця Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь (**15 сакавіка 1994 г.),** якая прадугледжвала ўвядзенне ў рэспубліцы прэзідэнцкай формы кіравання, **10 ліпеня 1994 г.** насельніцтва зрабіла выбар, **Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь абраны А.Р. Лукашэнка.** У перадвыбарнай платформе А.Р. Лукашэнка заявіў аб усталяванні ў рэспубліцы эканамічнай і палітычнай стабільнасці, паляпшэнні матэрыяльнага становішча насельніцтва, забяспячэнні сувернітэту пры цесным саюзе з Расійскай Федэрацыяй і

Репозиторий ВГУ

аб бескампраміснай барацьбе з карупцыяй і злачыннасцю. З гэтага часу пачаўся новы этап у правядзенні рэформаў на Беларусі. Было прынята рашэнне будаваць айчынную мадэль на сінтэзе лепшага, што назапашана грамадствам розных цывілізацый. Пастаўлена задача фармаваць беларускае грамадства як грамадства сацыяльнай справядлівасці, праводзіць эканамічныя пераўтварэнні пастунова, узнавіць сітуацыю, якая за савецкім часам забяспечвала абарону насельніцтва па ўсім спектры паслуг. Грамадзяне не маглі не падтрымаць прапанаваны курс. Працоўныя і большасць насельніцтва, якія мелі шматгадовы вопыт свайго функцыянавання ў сацыялістычнай сістэме, не разумелі той мадэлі, якая не забяспечыла паварот дзяржавы да лепшага іх існавання, да таго ж «выштурхоўвала» грамадскія формы кіравання з прадпрыемстваў і ўстаноў. У той жа час як кіраўніцтву рэспублікі так і насельніцтву было зразумела, што па многіх прычынах, вяртанне да ранейшага сацыялістычнага ўстройства стаў таксама немагчымым: за 1991-1994 гады дэмантаваны механізм планавання, перабудаваны фінансавы механізм, сістэма цэнаўтварэння, банкаўская сістэма, адбылася змена формаў уласнасці на сродкі вытворчасці ў шэрагу галін прамысловасці, транспарту, у сферы паслуг, аграпрамысловым комплексе. Улічваючы гэтыя і іншыя фактары, кіраўніцтва краіны прапанавала сімбіёзны шлях развіцця: захаванне камандных вышынь за адміністрыраваннем і ўключэннем некаторых элементаў канкурэнцыі ў якасці дадатковых кампанентаў эканамічнага механізму.

Выступаючы ў якасці кандыдата на пасаду Прэзідэнта падчас выбарчай кампаніі, а затым і пасля абрання, А.Г. Лукашэнка назваў галоўным кірункам у сваёй дзейнасці дасягненне кансалідацыі грамадства і ўмацаванне дзяржавы, барацьбу з беднасцю і забеспячэнне ўстойлівага росту дабрабыту насельніцтва. Прааналізаваўшы стан эканомікі і вызначыўшы прычыны расчаравання людзей, Прэзідэнт ўлічыў іх матывы аб неабходнасці узвысіць дзяржаўную ўладу над прыватнымі інтарэсамі, навесці ў краіне парадак. У кастрычніку 1994 года, з улікам новага бачання ўнутрыпалітычнага развіцця краіны, праведзена карэкціроўка ранейшага курсу. Канцэпцыя і методыка аздараўлення абстаноўкі ў краіне былі упершыню сістэмна вызначаны ў праграме неадкладных мер па выхаду эканомікі Рэспублікі Беларусь з крызісу (зацверджана 30.09. 1994 г.) [1, с. 2]. У праграме прадугледжаны комплекс ўзаемаўвязаных неадкладных мер, накіраваных на прыпынак спаду вытворчасці, тармажэнне інфляцыі, недапушчэнне далейшага падзення жыццёвага ўзроўню насельніцтва. Дзяржава мела намер стымуляваць эканамічны рост праз жорстка цэнтралізаваныя метады кіравання эканомікай, адначасова змякчаючы сацыяльныя наступствы той грамадскай няроўнасці, якая непазбежна для пачатковага этапу рынкавых адносін. Аб'ектыўная ацэнка абстаноўкі, разуменне таго, што пераўтварэнне варта праводзіць у адпаведнасці з інтарэсамі працоўных і рэальнымі магчымасцямі краіны, і што для змены свядомасці людзей спатрэбіцца час, стала асновай прынятага рашэння: праводзіць рэфармаванне старой сістэмы пастунова, укараняючы новыя рынкавыя падыходы, не адкідваючы сацыялістычныя прыёмы і метады эфектыўнага кіравання і гаспадарання. Сцэнар, па якім Беларусь з 1994 года рухалася да рынку, у якім толькі часткова выкарыстоўваўся вопыт станаўлення рынкавых адносін заходняга тыпу, выкладзены Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь на Другім эканамічным форуме ў 1998 г. ў Санкт-Пецярбургу. Гаворачы пра шлях развіцця рэспублікі ў постсавецкі час, больш канкрэтна аб пошуку айчыннай эканамічнай мадэлі, А.Г. Лукашэнка падкрэсліў: «Рэформа - гэта ўдасканаленне таго, што створана, таму, што зламаць і стварыць новае ў нас няма часу, ні сродкаў. Ды і ці трэба гэта рабіць навогул? »" [2, с.2]. Пазней (у 1999 г.) у сваім выступе ў Маскве ў Дзяржаўнай Думе А.Г. Лукашэнка ў чарговы раз пацвердзіў, што ў Беларусі пасля абрання першага Прэзідэнта ў развіцці дзяржавы былі ўлічаны гістарычныя ўрокі мінулых радыкальных падыходаў да грамадскіх пераменаў: «Мы з самага пачатку адмовіліся ад рэвалюцыйнай ломкі, аддаючы перавагу паступоваму рэфармаванню эканомікі, пераймаючы ўсё лепшае, што можа прапанаваць сусветны вопыт» [3, с. 2].

Важнай палітычнай падзеяй на этапе самастойнага развіцця рэспублікі стаў першы Усебеларускі сход (19-20 кастрычніка 1996 г.),на якім прысутнічала каля 5 тыс. чалавек. Сход абмеркаваў «Асноўныя напрамкі сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 1996-2000 гады», праект новай рэдакцыі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, а таксама пытанні, прапанаваныя Прэзідэнтам на рэспубліканскі рэферэндум. Тады ж распрацавана і зацверджана "Нацыянальная стратэгія ўстойлівага развіцця Рэспублікі Беларусь да 2010 года”. У гэтых дакументах была ўлічана як ўласная, так і расійская негатыўная практыка першых гадоў ліберальных рэформаў, прапанаваны больш эфектыўныя механізмы правядзення прыватызацыі, новыя тэрміны дэцэнтралізацыі і раздзяржаўлення. З усёй відавочнасцю тут праглядаўся курс

Рэпазіторый ВДУ

на дзяржаўнае рэгуляванне эканомікі, што сведчыла аб падтрымцы палітычнага і эканамічнага курсу кіраўніка дзяржавы. Прыватызацыя стала праводзіцца пры непасрэдным удзеле і пад кантролем Прэзідэнта краіны, ажыццяўляўся свядомы падыход да перадачы дзяржмаёмасці ў прыватную ўласнасць. Вядучыя прамысловыя прадпрыемствы засталіся ў дзяржаўнай уласнасці, што дазволіла выкарыстоўваць іх у інтарэсах ўсяго беларускага народа, а не ў інтарэсах асобных суб'ектаў. Прыпынены дэмантаж буйнай калгасна-саўгаснай вытворчасці, пры адмаўленні ад куплі-продажу зямлі сельскагаспадарчага прызначэння. Стаўка ў развіцці прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці зроблена на ўласныя сілы. З двух асноўных мадэляў рынкавай эканомікі, вядомых у сусветнай практыцы (ліберальнай і сацыяльнай арыентацыі), у Беларусі стала рэалізоўвацца мадэль сацыяльнай арыентацыі патэрналістскага тыпу, якая грунтуецца на свабодным суіснаванні розных формаў уласнасці, моцнай і эфектыўнай сацыяльнай функцыі дзяржавы[ 4. С.61]. 1995 год стаў паваротным у станаўленні беларускай эканамічнай мадэлі. Дзяржава паставіла пад свой кантроль рэгуляванне прапарцыянальнага развіцця дзяржаўных і недзяржаўных формаў уласнасці, узаемаадносіны паміж гэтымі ўкладамі, падтрымку структурных прапорцый, якія забяспечваюць эканамічную стабільнасць, цэнаўтварэнне і выкарыстанне працоўных рэсурсаў, а таксама, што з'яўляецца самым галоўным,- сацыяльна-эканамічную палітыку ў галіне аплаты працы і даходаў насельніцтва. Правільнасць такога падыходу ў кіраванні эканомікай і сацыяльнай сферай з боку беларускага кіраўніцтва ў крызісныя гады пацвярджае і сусветны вопыт. У 1933 годзе прэзідэнт ЗША Ф. Рузвельт прапанаваў праграму выхаду з крызісу «Новы курс», якая прадугледжвала шырокае ўмяшанне дзяржавы ў эканоміку. Рэалізацыя прапанаванай праграмы з адладжаным дзяржаўным кіраваннем ажывіла амерыканскую эканоміку ў даволі кароткія тэрміны

У Беларусі падобны падыход прадэманстраваў на гэтым этапе, таксама сваю жывучасць. Ён актывізаваў вытворчую дзейнасць. Пасля катастрафічнага абвалу вытворчасці пачаўся яе ўздым. Большасць вядучых галін наладзілі стабільнасць у рабоце. З 1995г. эканоміка Рэспублікі Беларусь увайшла ў стабілізацыйны перыяд з наступным штогадовым ростам. У 1996 г. упершыню адбыўся прырост валавага ўнутранага прадукту (у параўнанні з папярэднім 1995 г.) – на 3%, вытворчасці прамысловай прадукцыі – на 4%, спажывецкіх тавараў – на 9%, уводу жылля – на 35%.Сельскагаспадарчая вытворчасць павялічылася на 2%. З 1997 па 2000 год рост аб'ёмаў вытворчасці складаў штогод ад 10 да 18%. Рост ВУП ў 1997 годзе склаў больш за 11%, у 1998 – 8,4%. У 2000 годзе эканамічны рост паскорыўся: прырост ВУП склаў 8%, перавысіўшы ўзровень дакрызіснага і самага паспяховага для савецкай Беларусі 1990 года. У цэлым па большасці паказчыкаў першы пяцігадовы план (з 1996г.у рэспубліцы пакладзены пачатак постсавецкім пяцігодкам) быў выкананы. Прамысловая і сельскагаспадарчая вытворчасць ў 2000 годзе перасягнула паказчыкі 1991 г. Але на завяршэнні 2000г.заставалася яшчэ шмат стратных прадпрыемстваў і арганізацый.

Больш паспяхова гаспадарка Беларусі развівалася ў 2001-2005 гг. У гэты час не было ніводнага года без значнага прыросту валавога нацыянальнага прадукту. Павялічэнне ВУП у 2005г. у параўнанні з 2000г. склала 43%. Выпуск прамысловай прадукцыі за пяць гадоў павялічыўся на 52%, сельскагаспадарчай – на 26% [5, с. 15]. Вынікі такога ўзроўню былі параўнальныя з лепшымі перыядамі савецкай эпохі. Рост паказчыкаў забяспечваўся галоўным чынам дзякуючы дасягненням прамысловасці, асбліва гэта тычылася трактарабудаўнічай, нафтаперапрацоўчай і хімічнай галіны.У ліку передавых прадпрыемстваў у гэтыя гады знаходзіліся калектывы ВА "Мінскі трактарны завод», «БелАЗ», «МАЗ», беларускае унітарнае прадпрыемства "Беларускі металургічны завод», большасць прадпрыемстваў нафтаперапрацоўчай прамысловасці. Тут змаглі ў кароткія тэрміны наладзіць выпуск прадукцыі, якая мела попыт на знешніх рынках.

Нягледзячы на усе цяжкасці ўнутранага і знешняга парадку стабільна працавала большасць галін гаспадарчага комплексу і ў наступныя гады. Паспяховым амаль па ўсіх паказчыках стаў першы (2006) год трэцяй пяцігодкі: аб'ём вытворчасці прамысловай прадукцыі павялічыўся на 11,3%, ВУП павялічыўся на 9,9%. У сельскай гаспадарцы прырост склаў 6,1%.

Паколькі эканоміка рэспублікі па сваей структуры, маштабам вытворчасці заставалася экспартаарыянтаванай, шмат увагі надавалася эфектыўнай працы прадпрыемствам выпускаючым прадукцыю на экспарт. Высокімі паказчыкамі на гэтым этапе вызначаліся Белаўтазавод у Жодзіна, Салігорскі калійны камбінат, Наваполацкі і Мазырскі нафтаперапрацоўчыя заводы, Віцебскі тэлевізійны завод, вытворчае аб’яднанне “Атлант”, Мінскі трактарны і аўтамабільны заводы, і інш.. Тут праводзілася рэканструкцыя, увод новых

Репозиторий ВГУ

вытворчых магутнасцей. У сусветным маштабе вытворчасць вялікагрузных аўтамабіляў у Беларусі ў 2010г. раўнялася 30%, мініральных угнаенняў – 15%, трактараў – 6%. Толькі за студзень – красавік 2006 г. (у 60-гадовы свой юбілей) МТЗ выпусціў 16,6 тыс. трактараў [6. с.3].

Пэўнае развіцце атрымаў прыватны сектар. Паводле даных на 1.04.2008 г. у Беларусі налічвалася 51 тыс.малых прадпрыемстваў. З ліку сродкаў пазітыўнага ўплыву на эканамічнае развіцце ў першае дзесяцігодзе новага веку, несумненна, на першае месца трэба паставіць непасрэдна саміх вытворцаў, але, ў той жа час, варта прызнаць прысутнасць расійскага фактару: атрыманне ад Расіі энерганосьбітаў па ільготных цэнах і высокі тавараварот паміж дзяржавамі. Так, у 2006г. за 1 тыс. куб. м газу Беларусь плаціла 47 дал.ЗША. у той час як для краін Заходняй Еўропы такая колькасць каштавала 120-130 дал. Тавараварот паміж Рэспублікай Беларусь і Расіяй меў у гэтыя гады пастаянную тэндэнцыю да росту. Толькі за 2007 г. ен павялічыўся на 30,7% і складаў 26,1 млрд. амерыканскіх долараў. Параўнальна высокая якасць прамысловай прадукцыі дазваляла Беларусі весці гандль з многімі іншымі краінамі.

Сельскагаспадарчая вытворчасць рэспублікі па эфектыўным выкарыстанні вытворчых сіл перамясцілася ў перыяд 1995–2010 гг.ў лік перадавых краін. Ўстойлівы прырост прамысловай і сельскагаспадарчай прадукцыі даваў падставу разлічваць на спрыяльнае развіццё эканомікі Беларусі ў бліжэйшай і далёкай перспектыве. Меркавалася і ў далешым ажыццяўляць прагрэсіўне развіцце краіны за кошт росту прадукцыйнасці працы, ўкаранення новых тэхналогій і новых метадаў удасканалення вытворчасці і кіравання. Але ў 2008 г. прамысловасць рэспублікі папала ў складаную сітуацыю. Гэты год ўнёс істотныя змены ў станоўчую тэндэнцыю яе паспяховага ўздыму, якая выразна абазначылася з 1995–1996 гг. Ужо летам 2008г. намеціўся спад аб’емаў вытворчасці, павялічылася вымушаная няпоўная занятасць работнікаў, затым – інфляцыя. Глабальны сусветны фінансавы крызіс унёс карэктывы ў планы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. 2009 год паказаў, што рэалізацыя дзяржаўных планаў эканаічнага развіцця і стварэнне годных умоў жыцця і творчага развіцця чалавека, залежаць таксама ад знешняга ўплыву, ад стану эканомік і паводзін суседніх краін. Рэспубліка Беларусь тысячамі нітак звязана са знешнім светам, яе прамысловы комплекс цесна пераплецены інтэграцыйнымі сувязямі з замежжам і больш за ўсе – з Расеяй. Ужо ў 2008 годзе, з-за падзення пакупніцкай здольнасці многіх імпарцёраў, у тым ліку расійскіх, рэспубліка сутыкнулася з праблемай экспарту. Многія прадпрыемствы па выніках года панеслі значныя страты. Трывожныя наступствы 2008 году сталі адчувальныя ўжо на самым старце наступіўшага 2009 г. Памяншэнне попыту на экспартныя пастаўкі асноўных відаў прадукцыі прамысловых прадпрыемстваў прывяло да росту складскіх запасаў. Нягледзячы на прыкладзеныя намаганні па збыце выраблена́й прадукцыі, затаваранасць заставалася вельмі высокай (на пачатак 2010 года - 6 трлн руб. [7, с. 2]. Уплыў знешніх фактараў на эканоміку рэспублікі ў 2007-2015 гг. негатыўна адбіўся на выкананні прагназуемых паказчыкаў сацыяльнай сферы. Дэвальвацыя беларускага рубля, рост коштаў прывялі да зніжэння пакупніцкай здольнасці насельніцтва. Рэальная заработная плата (у сярэднім 500 даляраў) пасля 2008 году стала ніжэй ранейшай, мела тэндэнцыю да зніжэння (ў 2015 г. менш за 400 дал.). Працоўныя пенсіі адставалі ад узроўню заробкаў. Пры гэтым кошты на харчовыя прадукты, сацыяльна значныя тавары сталі плаваючымі. У складаных умовах урад рэспублікі прымае захады па адаптацыі эканомікі да існуючых знешніх умоў і ўзняцця дабрабыту насельніцтва. Але вырашыць усе складанасці ў эканамічным развіцці і адпаведна ўзняць даходы насельніцтва да сярэднееўрапейскага ўзроўню, пакуль не ўдаецца.

**Заключэнне.** Як заўважана ў публікацыі, па свайму зместу апошнія амаль тры дзесяцігодзі навейшай гісторы распадаюцца на два этапы –да сярэдзіны 90-х гг. і пасля. На першым этапе пераход да рынку з мэтай станаўлення новай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця, не меў строга выверанай і навукова абгрунтаванай праграмы. У кіраўніцтва рэспублікі ў сілу навізны таго, што адбывалася ў краіне , пераважала вера ў магчымасць хуткай трансфармацыі грамадскага развіцця праз самарэгулявання рыначнай эканомікі . Эканоміка рэспублікі і сацыяльная сфера знаходзіліся ў глыбокім крызісе. На другім этапе назіралася настойлівае імкненне да пераадолення негатыўных працэсаў у эканоміцы і фарміравання беларускай эканамічнай мадэлі. Новае кіраўніцтва дзяржавы на чале з Прэзідэнтам А.Г. Лукашэнка, прааналізаваўшы ў кастрычніку 1994 года стан эканомікі і вызначыўшы прычыны крызіснага стану, правяло карэкціроўку ранейшага курсу. З улікам новага бачання ўнутрыпалітычнага і сусветнага развіцця, у рэспубліцы распрацавана канцэпцыя неадкладных мер, накіраваных на прыпынак спаду вытворчасці, тармажэнне інфляцыі. Праграма прадугледжвала эканамічны рост праз жорстка цэнтралізаваныя

Рэпазіторый ВДУ

метады кіравання эканомікай. Разуменне таго, што пераўтварэнне варта праводзіць у адпаведнасці з інтарэсамі працоўных і рэальнымі магчымасцямі краіны, і што для змены свядомасці людзей спатрэбіцца час, у прынятым курсе прадугледжвалася праводзіць рэфармаванне старой сістэмы паступова: укараняючы новыя рынкавыя падыходы, не адкідваючы сацыялістычныя прыёмы і метады эфектыўнага кіравання і гаспадарання. Такі падыход да сацыяльна – эканамічнага развіцця краіны, нягледзячы на крайне неспрыяльныя знешнія ўмовы, прыносіў на этапе 1995–2010 гг. станоўчыя вынікі.

Спіс літаратуры
1. Постановление Верховного Совета Республики Беларусь от 30.09.1994 № 3249-XII «О программе неотложных мер по выходу экономики Республики Беларусь из кризиса» // Советская Белоруссия, 1994. – 2 нояб.
2. Советская Россия,1998. – 25июня.
3. Выступление А.Г. Лукашенко в Госдуме Российской Федерации // Советская Россия, 1999. – 31 окт.
4. Мандрик И.В. Патернализм или партнерство / Мандрик, И.В. // Беларуская думка. – №9, 2004. – С.60–65.
5. Устремленность в будущее: Беларусь, 1995–2008. – 120 с.
6. Минскй курьер, 2006. – 30 мая.
7. С.Б.Беларусь сегодня, 2010. – 23янв.

## РОЛЬ СИСТЕМЫ ОБРАЗОВАНИЯ В СОЦИАЛЬНЫХ ТРАНСФОРМАЦИЯХ ПЕРЕХОДНОГО ОБЩЕСТВА

*А.П. Мядель*
*Витебск, ВГТУ*

Решающим условием модернизации экономики и общества в целом выступают значительные объемы и высокое качество знаний, развитие и реализация «человеческого капитала». Огромные достижения в сфере образования уже легли в основу грандиозных социальных и научно-технических преобразований ведущих стран мира. Образовательная сфера развитых государств явилась стратегической точкой их роста в XXI веке. Мировой опыт свидетельствует, что только опережающее развитие образования формирует инвестиционную привлекательность страны и обеспечивает технологический прорыв.

Целью исследования является социально-философский анализ системы образования в условиях модернизации современного белорусского общества, его роли и новых возможностей влияния на процессы социальных преобразований в Республике Беларусь.

**Материал и методы.** Материалом работы послужили государственно-правовые документы, регулирующие и регламентирующие социальные отношения в сфере образования, научные издания и публикации периодической печати по данной проблематике. Основынм методом исследования стал системный подход в интерпретации Н. Лумана, рассматривавшего образование как символический конструкт, играющий ключевую роль в воспроизводстве социальной системы [1, с.196-235]. Широко использован также структурно-функциональный анализ, представленный в трудах И.В. Блауберга, Э.Г. Юдина, В.Н. Садовского, В.Г. Афанасьева, Н.Н. Моисеева[2, с. 99-109].

**Результаты и их обсуждение.** Система образования, фундаментом которой является современная наука, выступает не только основным фактором ускорения общественного прогресса, но и существенным образом влияет на человека, его способности. По мере изменений, которые происходили в обществе в процессе его перехода от индустриального социума к постиндустриальной реальности, менялся смысл, содержание образования, его место и роль в жизни людей. Если в индустриальную эпоху основное внимание в процессе образования уделялось обретению профессиональных знаний и навыков, то в сетевом обществе полноценное профессиональное развитие предполагает высокий уровень социальной и коммуникативной компетентности, общекультурной подготовки. Образование становится одним из важнейших показателей качества жизни, которое связано с представлениями о свободе и достоинстве личности, возможности ее самореализации. Современное отечественное образование в общем и целом вписывается в основные тенденции мирового развития, однако оно испытывает определенные сложности, обусловленные переходом к информационному обществу в нашей стране.

В условиях переходности приобретает актуальность антропологический смысл национального образования, которое призвано формировать человеческий капитал, дополняя его наращиванием социального капитала, способствующего укреплению социальных связей и отношений, и капитала культурного, создающего объединяющее людей общее интеллектуальное пространство и выступающего основой выработки мировоззрения. В этом случае образование

Репозиторий ВГУ